Пролетарыі ўсіх краёў, злучайцеся!

ГАЛОЎНАЕ КІРАЎНІЦТВА АДЗІНАЙ ГІДРА-МЭТЭОРОЛЁГІЧНАЙ СЛУЖБЫ пры НКЗ БССР

ДЭКАДНЫ БЮЛЕТЭНЬ ГІДРА-МЭТІНСТЫТУТУ

Адрас рэдакцыі: Менск, Шырокая 28. Гідра-мэтэоролёгічны Інстытут. Тэл. 21877 і 23280.

№ 10 (123) | 1—10 красавіка | 1933 г.

ЗЬМЕСТ

МЭТЭОРОЛЁГІЧНАЯ ХАРАКТАРЫСТЫКА

за 1—10 красавіка 1933 г.

Гэта дэкада пачалася даволі высокімі тэмпэратурамі, у межах ад 4 да 8°, але такія т-ры трымаліся вельмі мала, і 4-га чысла па ўсёй БССР, за выключэньнем толькі паўднёвай зоны, т-ры апусьціліся да 0—3°. 5-га наглядалася нязначнае падвышэньне, але ў наступныя дні т-ра ізноў зьніжаецца да 0°, а мясцамі і ніжэй (Менск, Мар'іна-Горка). У апошнія дні т-ра падвышаецца да 1-2°.

Сярэдняя дэкадная т-ра хістаецца ад 2 да 4°, што прыблізна на 1° ніжэй нормальнай для гэтай дэкады. Максымальная т-ра хісталася каля 10-12°, мінімальная—каля—1-2°. Мінімальныя т-ры наглядаліся пераважна ў апошнія дні дэкады.

Ападкі выпалі ў даволі вялікай колькасьці ў параўнаньні з нормальнымі месячнымі сумамі красавіка (30—40 мм). Некалькі меншыя колькасьці ападкаў наглядаліся ў паўночнай зоне (10-15 мм), на астатняй-жа тэрыторыі БССР колькасьці іх хісталіся ад 15 да 25 мм, а часам перавышалі нават 30 мм (Барысаў—32 мм, Васілевічы—33 мм).

Табліца вынікаў мэтэоролёгічных

Кліматычны раён	№№ па карце	Назва станцый	Тэмпэратура паветра															
			1	2	3	4	5	6	7	8	9	10		Сярэдняя	Нормальн.	Максым.	Мінімальн.	Чысло...
(Вазёрны)	2	Дрыса	4	6	1	0	2	1	0	0	2	2	—	2	—	8	—1	7
	3	Полацак	4	5	2	1	3	1	1	1	1	2	—	2	3	10	—1	7
	68	Гарадок	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
	84	Сураж	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
	7	Нова-Каралёва	3	4	1	0	3	0	0	1	0	1	—	1	2	9	—4	4
(Вадападзельны)	8	Лепель	4	5	1	0	1	1	0	0	1	1	—	2		12	—1	7
	15	Сяно	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
	75	Плешчаніцы	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
	70	Бобр	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
	13	Барысаў	5	4	2	1	3	1	0	0	2	2	—	2	3	10	—2	4
	16	Менск	5	5	2	1	2	1	—1	0	1	2	—	2	3	10	—2	7
	93	Бярэзіна	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
	23	Мар'іна-Горка	4	5	2	1	2	0	—1	0	1	2	—	2	3	9	—	—
	25	Асіпавічы	6	6	2	2	4	1	0	0	2	2	—	2	3	12	—2	4
	10	Ворша	4	4	2	1	3	1	2	1	2	1	—	2	2	10	—2	4
	19	Горкі	4	5	2	1	3	1	1	1	1	1	—	2	2	10	—3	10
(Раўнінны)	89	Клічаў	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
	28	Слуцак	5	6	2	2	3	1	0	0	2	2	—	2	—	10	—3	7
	119	Ратміравічы	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
	30	Мар.-Сосны	6	5	3	1	3	1	0	0	1	2	—	2	5	13	—2	7
	21	Магілеў	5	5	2	2	3	1	1	1	1	1	—	2	2	11	—1	10
	73	Чавусы	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
	27	Чэрыкаў	5	5	3	3	4	2	1	—1	0	1	—	3	3	10	—2	10
	171	Касьцюковічы	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
	31	Турск	6	5	3	2	4	3	0	1	1	0	—	2	3	10	—1	5
	32	Жлобін	6	6	3	3	5	3	0	1	2	1	—	3	4	12	—2	7
(Нізінны)	33	Жыткавічы	7	7	4	9	3	1	1	0	2	2	—	3	5	12	—2	8
	37	Калінкавічы	6	7	4	3	4	3	0	0	2	1	—	3	4	12	—1	7
	39	Лельчыцы	6	7	4	5	4	2	1	2	3	—	—	3	—	12	—1	10
	85	Чачэрск	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
	83	Барба	7	7	5	5	6	2	1	3	1	0	—	4	—	11	—2	8
	38	Гомель	7	7	5	4	5	3	1	1	2	1	—	4	4	12	—1	8
	35	Васілевічы	7	8	3	3	4	3	0	0	2	2	—	3	4	11	—1	6
	40	Людвінава	7	7	5	5	4	3	1	1	2	2	—	4	5	11	—2	4
	242	Красілаўка	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—

назіраньняў за 1—10 красавіка 1933 г.

Адносная вільготн. паветра за 13 г. у %	Тэмпэратура паверхні глебы: Максым.	Мініальн.	Чысло, калі на гл. мін.	Ападкі ў мм: 1	2	3	4	5	6	7	8	9	10		Сума	Мэтэоролёгічная зьява (у дужках адзначаны числы)
71	—	—	—	0.5	..	4.0	0.3	0.1	0.3	1.0	1.0	..	..	—	8.2	туман (10)
75	—	—	—	..	..	0.6	3.0	..	0.1	1.0	3.0	0.1	..	—	7.7	—
—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
—	—	—	—	..	..	2.0	6.0	..	..	2.0	2.0	5.0	..	—	17.0	—
76	15	—5	2	..	..	1.0	5.0	..	..	2.0	4.0	2.0	..	—	14.0	—
75	—	—	—	..	..	0.2	1.0	..	0.1	..	2.0	1.0	0.4	—	4.7	туман (5)
—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
—	—	—	—	..	..	1.0	2.0	5.0	6.0	6.0	2.0	0.2	1.0	—	23.2	—
—	—	—	—	..	0.2	10.0	0.2	0.1	3.0	3.0	0.4	4.0	1.0	—	21.9	—
79	—	—	—	..	..	..	3.0	17.0	2.0	5.0	3.0	0.2	2.0	—	32.2	туман (5)
77	17	—3	7	..	0.2	1.0	2.0	7.0	2.0	3.0	2.0	0.3	1.0	—	18.5	мяцель (7)
—	—	—	—	..	..	0.2	0.6	..	14.0	9.0	0.6	1.0	0.4	—	25.8	—
82	—	—	—	..	..	2.0	..	8.0	3.0	0.4	2.0	..	..	—	15.4	мяцель (7), бура (7)
76	—	—	—	..	0.2	..	7.0	0.3	2.0	5.0	5.0	0.1	1.0	—	20.6	туман (4, 5)
77	—	—3	2	..	..	1.0	7.0	..	..	1.0	6.0	2.0	4.0	—	21.0	туман (5, 9, 10)
74	21	—4	10	..	..	0.2	4.0	0.4	..	0.6	5.0	1.0	3.0	—	14.2	туман (2, 5)
—	—	—	—	..	..	0.1	4.0	0.5	0.4	7.0	3.0	4.0	2.0	—	21.0	—
72	—	—	—	..	..	0.4	7.0	6.0	1.0	0.3	2.0	..	..	—	16.7	туман (1)
—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
77	19	—4	7	..	0.1	..	7.0	1.0	2.0	0.2	3.0	0.1	..	—	13.4	туман (8, 9)
75	—	—	—	..	..	0.2	4.0	..	..	2.0	5.0	2.0	..	—	13.2	туман (5)
—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
71	—	—	—	..	..	0.2	2.0	0.4	..	0.1	2.0	3.0	5.0	—	12.7	туман (10)
—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
77	23	—	—	..	2.0	0.1	3.0	2.0	0.5	1.0	3.0	..	5.0	—	16.6	туман (5)
74	—	—	—	..	0.3	..	3.0	1.0	0.1	4.0	3.0	2.0	4.0	—	17.4	туман (5)
72	—	—	—	1.0	0.5	2.0	1.0	1.0	2.0	1.0	2.0	0.1	1.0	—	11.6	—
73	—	—	—	..	0.1	..	2.0	6.0	0.3	5.0	3.0	2.0	3.0	—	21.4	—
—	—	—	—	7.0	..	..	1.0	2.0	1.0	2.0	2.0	2.0	1.0	—	18.0	туман (3, 4)
·	—	—	—	4.0	..	0.3	2.0	7.0	0.2	3.0	1.0	1.0	5.0	—	23.5	Г
81	8	1	3	2.0	..	0.2	..	3.0	..	4.0	..	3.0	..	—	12.2	туман (3)
70	—	—	—	..	..	..	1.0	4.0	1.0	3.0	0.6	3.0	3.0	—	15.6	туман (3, 7), мяцель (1
71	10	—	—	..	0.3	..	2.0	14.0	1.0	7.0	2.0	3.0	4.0	—	33.3	—
69	17	—3	—4	..	1.0	..	0.4	15.0	0.2	3.0	1.0	3.0	2.0	—	25.6	—
—	—	—	—	4.0	..	..	..	..	6.0	1.0	3.0	1.0	5.0	—	20.0	—

Табліца вынікаў мэтэоролёгіч. назіраньняў за 1—10 красавіка 1933 г.

Кліматычны раён	№№ па карце	Назва станцый	Вецер: Пераважаючы — Напрамак	Вецер: Пераважаючы — Хуткасьць	Вецер: З максым. хуткасьцю — Напрамак	Вецер: З максым. хуткасьцю — Хуткасьць	Інсоляцыя ў %%	Сярэдняя воблачнасьць у 10-бальвай сыстэме — Агульная	Сярэдняя воблачнасьць у 10-бальвай сыстэме — Ніжняя	Сярэдні стан паверхоўнага пласту глебы (на глыбіні 10—15 см)
I Паўночны (Вазёрны)	2	Дрыса	NW	6	W	9	—	8	8	мокрая
	3	Полацак	NW	4	SW	6	—	9	9	„
	68	Гарадок	—	—	—	—	—	—	—	—
	84	Сураж	—	—	—	—	—	—	—	мокрая
	7	Нова-Каралёва	NE	4	NE	6	8	9	9	заслана мокрым сьнегам
II Пераходны (Вадападзельны)	8	Лепель	N	4	NW	9	—	9	8	мокрая
	15	Сянно	—	—	—	—	—	—	—	—
	75	Плешчаніцы	—	—	—	—	—	—	—	—
	70	Бобр	—	—	—	—	—	—	—	мокрая
	13	Барысаў	NW	4	W	9	—	9	9	заслана мокрым сьнегам
	16	Менск	N	4	N	6	—	9	8	вільготная
	93	Бярэзіна	—	—	—	—	—	—	—	мокрая
	23	Мар'іна-Горка	NW	6	NW	17	—	9	8	заслана мокрым сьнегам
	25	Асіпавічы	NW	4	SE	9	—	10	9	мокрая
	10	Ворша	SW	4	SW	6	—	9	8	„
	19	Горкі	W	4	W	6	—	10	8	„
III Цэнтральны (Раўнінны)	89	Клічаў	—	—	—	—	—	—	—	мокрая
	28	Слуцак	NW	6	NW	17	—	9	8	—
	119	Ратміравічы	—	—	—	—	—	—	—	—
	30	Мар'іна-Сосны	W	4	W	12	—	9	9	мокрая
	21	Магілеў	S	4	S	14	—	8	8	мокрая
	73	Чавусы	—	—	—	—	—	—	—	—
	27	Чэрыкаў	NW	4	SW	9	—	9	9	мокрая
	71	Касьцюковічы	—	—	—	—	—	—	—	—
	31	Турск	W	4	W	6	—	9	9	мокрая
	32	Жлобін	N	4	N	6	—	9	8	вільготная
IV Паўднёвы (Нізінны)	33	Жыткавічы	NW	4	NW	12	—	9	9	„
	37	Калінкавічы	NW	4	W	9	—	9	8	мокрая
	39	Лельчыцы	W	5	SW	6	—	9	8	—
	85	Чачэрск	—	—	—	—	—	—	—	мокрая
	83	Барба	SW	4	S	9	—	8	8	„
	38	Гомель	NW	2	SW	9	—	9	9	„
	35	Васілевічы	NW	6	SW	9	13	9	9	вільготная
	40	Людвінава	W	4	N	9	—	9	9	мокрая
	242	Красілаўка	—	—	—	—	—	—	—	„

На працягу дэкады ападкі разьмеркаваліся наступным чынам: толькі ў першыя 2-3 дні яны наглядаліся ў малых колькасьцях і, нават, у большасьці мейсц зусім не наглядаліся. Далей-жа амаль кожны дзень паўсюды наглядаецца выпадзеньне ападкаў, прычым асабліва значныя колькасьці выпалі ў пераходнай і цэнтральнай зонах 4-га красавіка; па ўсёй БССР, за выключэньнем паўночнай зоны, 5-га і мясцамі 7-га і 8-га красавіка.

У другой палове дэкады ападкі выпадалі галоўным чынам у выглядзе сьнегу.

Праўда, сьнегавы насьціл ад выпадзеньня гэтага сьнегу ўтвараўся вельмі ненадоўга і, звычайна, удзень, калі падвышалася т-ра, зьнікаў, але ён перашкаджаў прасыханьню глебы. У гэты час мейсцамі нават адзначаны мяцеліцы. Наогул надвор'е на працягу гэтай дэкады асабліва ў 2-ой палове яе было вельмі халоднае, сырое, пахмурнае. Воблачнасьць за дэкаду трымаецца блізка каля 100%, сонечнае-ж зьзяньне складае толькі 8—13%.

Вецер пераважаў паўночна-заходняга сэктару, хуткасьці яго мясцамі дасягалі вельмі значных вялічынь (17 м/сэк.), асабліва ў цэнтральнай частцы БССР.

Н. Малішэўская.

С/Г. ГІДРОМЭТЭОРОЛЁГІЧНАЯ ХАРАКТАРЫСТЫКА.

Першая дэкада красавіка, па руху надвор"я зьяўлялася зусім няспрыяючаю для разгортваньня палявых работ. Палявыя работы, якім спрыяла надвор"е першых лічбаў дэкады, і нават у паасобных колгасах і саўгасах паўднёвай часткі БССР, **сяўба** раньніх зернавых, а ў паўночных раёнах і раёнах пераходнай зоны разгортваньне **звышраньніх пасеваў** ільну былі затрыманы выключна з-за дрэнных умоў надвор"я.

Характар надвор"я на працягу ўсёй дэкады, у с/гаспадарчым сэнсе, магчыма падзяліць на тры часткі:

1. У першыя 2 дні было зусім магчыма вытвараць у паўднёвых раёнах на лёгкіх глебах розныя с/гасп. работы, таму што надвор"е было цёплае і сухое.

2. З 3-га па 5-ае красавіка ўключна магчыма было праводзіць некаторыя работы, як возка гною і іншыя ня зьвязаныя з апрацоўкай глебы работы, так як наступіла некаторае пахаладаньне і выпадалі ападкі.

3. З 6 па 10-ае ўключна наступіла пахаладаньне, якое супадала з штодзенным выпадзеньнем ападкаў, пераважна ў выглядзе сьнегу, што зусім магло супыніць усе с/г. палявыя работы. Праўда, што 9-га і 10-га наступіла зусім нязначнае пацяпленьне, але-ж яно не магло ўнесьці якой-небудзь зьмены ў карысьць с/гаспадаркі.

Звышраньнія пасевы магчыма было вытвараць да 5-га красавіка. Ападкаў за дэкаду выпала значная колькасьць, асабліва ў пераходнай і паўднёвай зонах, а ўмоў для перасыханьня глебы ня было зусім.

Становішча азімых культур да гэтага пахаладаньня было зусім добрае і гэтакае пахаладаньне не магло пагор-

шыць такога становішча, але-ж дакладных матар"ялаў, абгрунтоўваючых гэтую думку, з мейсц яшчэ не паступіла.

Мінімальныя т-ры на паверхні глебы да —5⁰ наглядаліся на тэрыторыі БССР толькі ў адным выпадку, што пры сучасным становішчы азімых не магло пашкодзіць іх.

Ф. Рабаконь.

МЭТЭОРОЛЁГІЧНАЯ ХАРАКТАРЫСТЫКА

восені 1932 і зімы 1932-33 г. да сакавіка 1933 г.

Пачатак восені 1932 г. у БССР трэба лічыць з 2-й дэкады верасьня. Працягвалася яна некалькі больш 2-х месяцаў, да сярэдзіны лістапада.

На працягу ўсёй восені тэмпэратура трымаецца вельмі высокая, перавышаючая нормальную ў сярэднім на 2⁰. Асабліва высокімі вызначаюцца наступныя пэрыоды: 17—20-ае верасьня, калі сярэднія сутачныя т-ры даходзілі да 15—20⁰, потым пэрыод з 24-га па 28-ое з такімі-ж высокімі т-рамі. Гэтыя пэрыоды можна было-б цалкам аднесьці да лета, настолькі цёплае надвор"е было на працягу гэтых пэрыодаў.

Першыя числы кастрычніка характарызуюцца таксама высокімі т-рамі, асабліва на поўдні БССР. Пасьля гэтага тэрміну пачалося паступовае зьніжэньне, да 3-5⁰. У сярэдзіне месяца ізноў наглядаўся ўздым т-р, у сярэднім да 15⁰, а з 18-га числа да канца кастрычніка мелі чаргаваньне нязначныя падвышэньні і зьніжэньні т-ры ад 5 да 10⁰.

У лістападзе спачатку т-ра хісталася ад 0 да 10⁰, але з 6-7 числа пачалося няўхільнае зьніжэньне, і **13-га сярэднія сутачныя т-ры пераходзяць праз 0⁰ і робяцца адмоўнымі.** Гэты тэрмін магчыма лічыць пачаткам зімы.

Першы замаразак адзначан 16 верасьня, гэты тэрмін трэба лічыць вельмі раньнім. Наступны замаразак, толькі мейсцамі, быў адзначан 23 верасьня. На працягу 3-х дзён—7-9 кастрычніка—паўсюды адзначаны моцныя замаразкі.

З боку выпадзеньня ападкаў восень магчыма характарызаваць наступным чынам:

У верасьні выпала колькасьць ападкаў, блізкая да нормальнай, з некаторым перавышэньнем у паўночна-заходняй палове БССР. У сярэднім сумы хісталіся ад 40 да 70 мм. У кастрычніку колькасьць ападкаў значна перавысіла норму, у 2 і нават у 3 разы, прычым вельмі вялікія колькасьці ападкаў адзначаны па ўсёй БССР. Першая палова лістапада характарызуецца сумамі ападкаў, вельмі блізкімі да нормальнай. Асабліва значныя колькасьці ападкаў наглядаліся ў наступныя пэрыоды: у пачатку 2-ой дэкады верасьня, потым у пачатку 3-яй дэкады, калі сутачныя сумы мейсцамі перавышалі 20 мм, 3-4-га кастрычніка; наогул у кастрычніку рэдкія дні ня было ападкаў, і сутачныя колькасьці даволі часта перавышалі 20 мм. У лістападзе толькі ў першыя дні наглядаліся значныя ападкі.

Навальнічная дзейнасьць у гэту восень працягвалася вельмі позна, нават у кастрычніку наглядаліся навальніцы з градам у першыя числы і потым у сярэдзіне месяца.

Пяройдзем цяпер да характарыстыкі тэмпэратурнага рэжыму зімы. Зіма, як вышэй адзначалася, пачалася з паловы лістапада, але яшчэ доўгі час не ўстанаўлялася канчаткова адмоўная т-ра. Значна панізілася т-ра ў пэрыодзе з 18-га па 21-ае лістапада, прыблізна да —10°, але 23-га ізноў устанавіліся дадатныя т-ры, якія трымаліся аж да 9-га сьнежня. Пасьля гэтага тэрміну на працягу сьнежня т-ра яшчэ 2 разы ўздымалася вышэй 0°: з 17 па 21-ае і з 25 па 27-ае. Наогул, як бачым з табліцы № 1, сярэдняя месячная т-ра сьнежня вышэй нормальнай на 4-5°. Студзень пачаўся таксама даволі высокімі т-рамі, ад —1 да —5°, але з канца 1-ай дэкады пачалося паступовае пахаладаньне і нізкія т-ры, да —20°, устойліва трымаліся да 26-га студзеня, калі адразу адбылося значнае пацяпленьне, і т-ра падвысілася на 10-15°. Далей т-ры з хістаньнямі ад 0° да —10° трымаліся на працягу ўсяго лютага, і толькі ў апошняй дэкадзе яго т-ра паніжалася да —15°. Наогул сярэдняя т-ра студзеня была на 2-3° ніжэй нормальнай, сярэдняя-ж т-ра лютага вельмі блізка да нормальнай.

Табл. № 1.

Сярэдняя месячная т-ра паветра.

Назва станцый	Верасень		Кастрычнік		Лістапад		Сьнежань		Студзень		Люты	
	1932 г.	Адхіл. ад нормы	1932 г.	Адхіл. ад нормы	1932 г.	Адхіл. ад нормы	1932 г.	Адхіл. ад нормы	1933 г.	Адхіл. ад нормы	1933 г.	Адхіл. ад нормы
Новае-Каралёва . .	12.7	+2.4	6.1	+1.9	0.0	+1.4	−1.1	+4.9	−10.5	−2.4	−7.9	−0.4
Горкі . .	13.0	+2.0	6.7	+2.0	0.3	+1.3	−0.8	+5.0	−10.4	−2.3	−7.9	−0.4
Менск . .	13.6	+2.1	6.9	+1.6	1.1	+1.2	−0.5	+3.9	−10.1	−3.4	−5.5	+1.3
Турск . .	14.4	+2.4	7.7	+2.0	0.9	+1.2	−0.1	+4.7	−10.1	−3.1	−6.2	0.0
Жыткавічы	14.9	+2.2	8.4	+2.0	1.6	+0.9	0.4	+3.8	−9.3	−3.3	−4.4	+0.5
Васілевічы.	14.9	+2.6	8.3	+2.1	1.5	+1.3	0.3	+4.4	−9.8	−3.2	−5.2	+0.2

Ападкі, наогул кажучы, за зіму выпадалі ў малых кольказьцях. У лістападзе і сьнежні колькасьці іх у сярэднім нормальныя, затое ў студзені ападкі нідзе не дасягалі 20 мм, у большасьці-ж хісталіся ад 5 да 10 мм. У лютым было некаторае перавышэньне нормы, асабліва ў паўднёвай кліматычнай зоне.

Пэрыоды з асабліва значным выпадзеньнем ападкаў былі: пачатак (5-7-ае) сьнежня і пачатак лютага, у астатні-ж час надвор'е было пераважна сухое або з нязначнымі ападкамі.

Месячныя сумы ападкаў.

Назва станцый	Верасень		Кастрычнік		Лістапад		Сьнежань		Студзень		Люты	
	1932 г.	Норма	1932 г.	Норма	1932 г.	Норма	1933 г.	Норма	1933 г.	Норма	1933 г.	Норма
Полацак .	121	44	107	38	30	28	46	35	16	28	48	23
Новае-Каралёва . .	69	60	140	50	25	40	53	39	11	34	50	27
Ворша . .	67	71	109	43	22	35	41	46	8	33	44	27
Горкі . .	53	54	97	40	37	34	36	37	9	34	47	30
Менск . .	71	53	108	37	18	42	37	43	14	36	39	37
Мар'іна-Горка . .	65	56	95	42	21	34	31	36	2	29	16	25
Магілеў .	55	54	100	44	29	41	49	43	10	35	62	30
Чэрыкаў .	48	47	106	51	37	43	42	38	9	28	69	23
Васілевічы.	34	59	123	20	20	38	27	40	6	33	42	30

Сьнегавы насьціл у гэту зіму ўстанавіўся вельмі позна. Першае выпадзеньне сьнегу наглядалася 20 кастрычніка, але яшчэ і ў пачатку лістапада сьнегавы насьціл не ўтварыўся. Утварыўся ён упяршыню толькі 18 лістапада, але трымаўся толькі 4 дні, прычым вышыня яго хісталася ад 1 да 5 см. У сьнежні ў канцы 1-ай дэкады толькі на паўночы БССР зноў зьявіўся сьнегавы насьціл, але зараз-жа зьнік. У канцы сьнежаня толькі на ўсходзе зьяўляецца вельмі тонкі і няроўнамерны сьнегавы насьціл. У студзені было амаль такое самае становішча, як і ў сьнежні, але зусім па іншай прычыне. Вельмі малыя ападкі, ня гледзячы на ўстойлівыя нізкія т-ры, ня далі магчымасьці сьнегавому насьцілу дасягнуць значнай велічыні. Тэрмінам канчатковага ўстанаўленьня сьнегавога насьцілу ў БССР у дадзеную зіму трэба лічыць 8 студзеня, але колькі-небудзь значнай вышыні (10-15 см) ён дасягае толькі ў лютым, у пачатку якога выпалі даволі значныя ападкі. На працягу ўсяго лютага наглядалася паступовае нарастаньне сьнегавога насьцілу. І к канцу месяца вышыня яго дасягала 30-40 см. У параўнаньні з нормальнымі для БССР вышынямі сьнегавога насьцілу, у гэту зіму ён, як відаць з табліцы № 3, значна меншы і толькі ў апошняй, а мейсцамі ў 2-ой дэкадзе лютага вышыні робяцца блізкімі да нормальных, а часам нават перавышаюць іх.

Табл. № 3.

Сярэдняя вышыня сьнегавога насьцілу па дэкадах (1—вышыня ў зіму 1932—33 г.; 2—нормальная вышыня).

Назва станцый		Лістапад			Сьнежань			Студзень			Люты		
		I	II	III	I	II	III	I	II	III	I	II	III
Новае-Каралёва .	1	1	2	2	1	3	2	2	4	7	22	38	44
	2	1	4	7	9	13	18	21	25	29	33	38	40
Ворша . .	1	0	1	1	0	0	0	0	1	2	11	21	30
	2	0	1	5	6	9	12	18	21	24	29	32	32
Горкі . .	1	1	1	1	—	1	0	1	2	4	13	29	28
	2	0	2	4	8	12	18	21	26	30	36	39	40
Менск . .	1	—	—	—	1	2	0	2	4	10	16	21	26
	2	0	2	4	5	8	12	15	16	18	22	27	28
Мар'іна-Горка . .	1	—	—	—	—	—	—	1	3	8	12	18	19
	2	0	2	3	4	5	9	12	15	16	18	18	19
Магілеў .	1	0	0	0	—	—	—	1	2	5	10	25	32
	2	0	2	5	8	13	19	24	29	31	36	40	40
Гомель . .	1	0	0	0	—	0	—	1	3	5	12	25	27
	2	0	1	2	4	6	11	19	19	21	29	26	27
Васілевічы .	1	0	0	0	0	0	—	1	4	4	9	25	30
	2	0	0	1	2	5	8	12	16	18	16	18	19

Увага: 0 у таблíцы адзначае, што сьнегавы насьціл за дэкаду менш 0,5 см.
— адзначае, што сьнегавога насьцілу зусім ня было.

Н. Малішэўская.

РАЗГОРНЕМ АБМЕН ВОПЫТАМ

Студзеньскі Пленум ЦК і ЦКК УсеКП(б) паставіў перад усімі рабочымі, ІТР, колгасьнікамі і служачымі задачу асваеньня буйных тэхнічных завоёў нашае социялістычнае гаспадаркі, якія зроблены на працягу першай пяцігодкі.

Адзіная Гідромэтслужба таксама значна пасунулася ўперад за апошнія чатыры гады, шырока разгарнуўшы сваю сетку назіральных пунктаў, узброіўшыся новымі прыладамі і абсталяваньнем (самапісцы ўсіх відаў, аэротэодоліты, круцелкі новых сыстэм і г. д.).

Гэтыя прылады і абсталяваньне, якія раней налічваліся адзінкамі нават на першаклясных станцыях, зараз усё больш і больш насычаюць нашу сетку і работы.

Дрэннае знаёмства работнікаў з гэтымі прыладамі, нёдастатковыя навыкі ў зьвяртаньні з дакладнымі прыладамі, акрамя таго, што прыводзяць да значнае колькасьці паломак, яшчэ і ў

вялікай ступені зьнішчаюць якасьць матар'ялаў назіраньняў. Усё гэта павінна быць у самы кароткі час зьліквідавана і пагэтаму зусім своечасова пастаўлена ў парадак дню задача поўнага асваеньня тэхнічных дасягненьняў першай пяцігодкі.

У выкананьні гэтае задачы выключнае месца займае абмен вопытам.

Асабліва вялікую ролю адыгрывае абмен вопытам ва ўмовах АГМС, пры тэрыторыяльнай раскіданасьці яе органаў (станцый, пастоў ды інш.).

У такіх умовах цікавае і карыснае мерапрыемства, якое ўзьнікае на аднэй з станцый, зьяўляецца вядомым выключна толькі гэтай станцыі, у той час, калі на другіх станцыях магчыма працуюць над вырашэньнем гэтага-ж самага пытаньня. Маецца шмат прыкладаў таго, калі ўмелае вывучэньне і скарыстаньне вопыту другіх колектываў і прадпрыемстваў значна скарачала тэрміны наладжаньня вытворчых процэсаў і пускавыя пэрыоды для многіх новабудоўляў.

Вось чаму, пачынаю з мая месяца, група рацыяналізацыі прыступае да пэрыодычнага асьвятленьня дасягненьняў нашых станцый, пастоў і паасобных работнікаў у галіне асваеньня тэхнікі працы і прылад, шляхам прысьвечаньня паасобных нумароў дэкаднага бюлетэню Гімэіна гэтым пытаньням, арганізуючы ў ім разьдзел абмену вопытам.

Першы нумар бюлетэню, прысьвечаны абмену вопытам, выходзіць у маі.

Група рацыяналізацыі зьвяртаецца да ўсіх работнікаў АГМС БССР з просьбаю прыняць актыўны ўдзел у выпуску гэтага нумару. Трэба пры гэтым памятаць, што кожнае самае дробнае, самае нязначнае дасягненьне, стаўшы вядомым шырокім колам работнікаў і будучы ўжыта ў вялікім маштабе, дае магутны эфэкт.

Булаўка А.

ХРОНІКА

Групаю рацыяналізацыі Гімэіну БССР атрыманы „Інструкцыі аб парадку падачы заяў на выдачу аўтарскіх пасьведчаньняў, аб парадку прэміраваньня вынаходнікаў і г. д."

Работнікі пэрыфэрыйных органаў АГМС БССР могуць выпісаць з Гімэіну гэтыя інструкцыі бясплатна.

АБ'ЯВА

У маі м. г. выходзіць спэцыяльны нумар дэкаднага бюлетэня Гімэіну, які будзе прысьвечаны абмену вопытам.

Корэспондэнцыю адрасаваць: г. МЕНСК, Шырокая 28, Гідромэтінстытут.

Групе рацыяналізацыі.

Адказны рэдактар **М. Л. ЛЕЙВІКАЎ**

Менск. Друкарня БАН. Зак. № 4392. Гарліт № 1263. Тыр. 1000 экз. 10 стар.